**Кароткін, Н.** Так разгортвалася барацьба / Н. Кароткін // Герой працы (Шуміліна). – 2008. – 2 ліп. – С. 1, 4.

## ТАК РАЗГОРТВАЛАСЯ БАРАЦЬБА

… У пачатку чэрвеня 1942 года група на чале з С. М. Кароткіным праз лінію фронту перайшла ў тыл ворага і дабралася да Сіроцінскага раёна. Пачалася актыўная работа па стварэнню партызанскіх атрадаў. Да групы далучаліся мясцовыя жыхары, уліўся атрад сакратара райкама КП(б)Б В. М. Фралова, групы байцоў Чырвонай Арміі, якія апынуліся ў акружэнні і вялі барацьбу з ворагам, група дыверсантаў, перакінутая праз лінію фронту.

Літаральна за дзесяць дзён было створана некалькі партызанскіх атрадаў, якія 20 чэрвеня 1942 года па рашэнню бюро Сіроцінскага РК КП(б)Б аб'ядналіся ў партызанскую брыгаду. Да канца 1942 года ў брыгадзе налічвалася каля дзвюх тысяч байцоў. А ў сакавіку 1943 з брыгады Кароткіна было ўтворана дзве брыгады: імя С. М. Кароткіна і імя У. І. Леніна.

Партызаны адразу ўключаліся ў барацьбу з фашыстамі. 4 ліпеня 1942 года 1-ы атрад брыгады напаў на фашысцкі гарнізон у Сіроціне. У гарнізоне было 75 немцаў і столькі ж паліцэйскіх. Раптоўнасць нападу, спланаванасць аперацыі прынеслі партызанам поспех: было знішчана каля 50 гітлераўцаў і паліцаяў, у тым ліку камендант гарнізона, спалены камендатура, інтэрнат, 5 аўтамабіляў, склад з гаручым. Атрад імкліва адышоў, маючы ўсяго аднаго параненага байца.

Паспяховымі былі і іншыя аперацыі партызанаў. У выніку баявой аперацыі на станцыі Язвіна 28 ліпеня 1942 года знішчана 48 варожых салдат і афіцэраў, спалены будынак станцыі і ўся апаратура, разбураны сотні метраў чыгункі і тэлеграфнай лініі.

У партызанскай брыгадзе Кароткіна штодзённа большасць атрадаў была задзейнічана ў баявых аперацыях. З 14 чэрвеня па 14 ліпеня 1942 года ніводны дзень не абыходзіўся без баёў з ворагам. У адным з іх атрад Несцерава-Сіпко забіў нямецкага генерала, былі захоплены важныя дакументы.

29 жніўня 1942 года на чыгуначнай лініі паміж станцыямі Обаль і Лоўша была праведзена буйная аперацыя. Партызаны разбурылі 5,5 кіламетра чыгункі, у чатырох месцах перакапалі насып, знішчылі лініі сувязі. Рух на чыгунцы спыніўся на тыдзень. Кіраўніцтва нямецкай чыгуначнай дырэкцыі ў сваіх зводках паведамляла: «Участак Полацк–Віцебск амаль поўнасцю паралізаваны. Адпраўляць цягнікі ў бок Смаленска немагчыма. У Полацку затор (25 цягнікоў), тое ж у Віцебску (30 эшалонаў).» Гэта быў пачатак «рэйкавай вайны», якая ўнесла значны ўклад у перамогу Чырвонай Арміі.

У выніку дзейнасці брыгады Кароткіна за лета 1942 года былі знішчаны сотні фашыстаў, разбіты 30 аўтамашын, разбураны каля 6 км чыгункі, пушчаны пад адхол 4 цягнікі, рух цягнікоў паміж Віцебскам і Полацкам затрыманы на 15 сутак. У партызанскай зоне ў жніўні і верасні 1942 года было мабілізавана 1138 чалавек прызыўнога ўзросту, якія перапраўлены праз лінію фронту ў распараджэнне камандавання Чырвонай Арміі.

Фашысты неаднаразова пыталіся знішчыць партызанскія атрады. Аператыўная зводка Цэнтральнага штаба партызанскага руху ад 10 верасня 1942 года паведамляе, што партызаны брыгады Кароткіна ў перыяд з 1 чэрвеня па 1 жніўня вялі абарончыя баі з часткамі вермахта, узмоцненымі бронецягнікам. На важнейшай чыгуначнай магістралі нямецкае камандаванне кінула

супраць сіроцінскіх партызанаў армейскую дывізію з танкамі, авіяцыяй, артылерыяй. Карнікі знішчылі ў раёне 25 вёсак, расстралялі сотні мясцовых жыхароў. З цяжкімі ўпартымі баямі партызанская брыгада змяніла зону дзейнасці, але поўнасцю захавала баяздольнасць. Цэнтральны штаб партызанскага руху адзначаў у ліку 12 лепшых партызанскіх злучэнняў і брыгаду С. М. Кароткіна.

Камбрыг Сямён Міхайлавіч Кароткін загінуў у авіякатастрофе ў кастрычніку 1942 года, калі вяртаўся з паездкі ў Маскву. Яго імя прысвоена створанай ім брыгадзе. Кароткінцы ваявалі да поўнага вызвалення Беларусі.

Больш за шэсць дзесяцігоддзяў мінула, але памяць аб Вялікай Айчыннай вайне становіцца яшчэ больш значнай. Памятаюць аб баявых паходах ветэраны, ведаюць аб іх подзвігу землякі.

**Н. Кароткін**